# Адзел адукацыі , спорту і турызму Старадарожскага райвыканкама ДУА “ Горкаўская сярэдняя школа Старадарожскага раёна”



Музей – гэта матэрыяльнае і духоўнае увасабленне памяці розных пакаленняў. У музеі можна не толькі пазнаёміцца з экспанатамі, дакументамі і фотаздымкамі, але і прасачыць вялікі шлях, які прарабілі настаўнікі і вучні школы. На працягу 35 гадоў музейныя фонды папаўняліся і пашыраліся.

Музей Горкаўскай сярэдняй школы пачынае сваю гісторыю з 1 лістапада 1977 года.

**Назва музея** – “Этнаграфія, гісторыя вёскі Горкі”

**Дата прысваення статуса “Народны музей”** – чэрвень 2014 года.

**Профіль музея** – эколага-краязнаўчы.

Метадычную дапамогу аказвае Старадарожскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей.

Музей знаходзіцца на трэцім паверсе і мае агульную плошчу музейнага памяшкання 132 м. кв.

**Асноўныя разделы музея**

1. Прылады працы і прадметы быту сялян 19-20 ст.ст.



2. Сялянская хата ў 19 - п.п. 20 ст.ст.
3. Мінулае вёскі Горкі
4. Шляхамі баявой Славы
5. Аўганістан ў маім лёсе
6. Гісторыя школы
7. Прырода роднага краю

У 80-я гады мінулага стагоддзя школьнаму музею пашанцавала, з запасных фондаў Белавежскай пушчы былі перададзены чучалы жывёл і птушак, якія ўпрыгожылі раздзел “Прырода роднага краю”.

**Колькасць экспанатаў асноўнага фонду – 820.**

**Найбольш каштоўныя экспанаты**

1. Пасведчанне аб заканчэнні Горкаўскага народнага вучылішча (1893г.).
2. Царкоўна-прыходска кніга 1832 года (рэшткі).
3. Падшыўка газет (1905 г.).
4. Чарнавік справаздачы аб узнікненні падпольных груп у вёсках Старадарожскага раёна (жнівень 1943 г.).
5. Ложак драўляны (1895 г.).
6. Выпуск падпольнай газеты "За Советскую Родину".



Язык музея – гэта мова арыгінала, першакрыніцы гістарычнай інфармацыіі. Дакументальныя матэрыялы ярка і пераканаўча распавядаюць пра падзеі мінулага.

Музей унікальны. Гэта не толькі памяць але і своеасаблівы храм культуры. Атмасфера музея заўсёды спрыяе стварэнню асабістых пачуццяў.

Музей – гэта месца, дзе захоўваецца гістарычная памяць народа, памяць пра нашых продкаў, іх мары, памкненні, жаданні, дасягненні. Для людзей вельмі важна ведаць сваё месца ў сённяшнім дні, каб з надзеяй глядзець ў будучыню.